# Інфармацыя аб дзейнасці
# Грамадскага аб'яднання "Самадзеяльны клуб па міні-футболе "Аматар"
# за 2021 год

ГА "Самадзеяльны клуб па міні-футболе "Аматар" на падставе артыкулу 24 Закона Рэспублікі Беларусь ад 04.10.1994 г. "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (далей – Закон) і артыкулу 9-2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30.06.2014 г. № 165-З "Аб мерах па прадухіленні легалізацыі даходаў, што атрыманыя злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага знішчэння" прадстаўляе наступную інфармацыю (справаздачу) аб сваёй дзейнасці і паступленні і выдатках грашовых сродкаў і іншай маёмасці за 2021 год.

Грамадскае аб'яднанне "Самадзеяльны клуб па міні-футболе "Аматар" паведамляе, што згодна з пунктам 2.5. Статуту не ажыццяўляе прадпрымальніцкай дзейнасці, не ствараe камерцыйных арганізацыяў і не ўдзельнічае ў іх, з моманту свайго ўзнікнення гаспадарчай дзейнасцю не займалася, асноўных фондаў, што належаць падаткаабкладанню таксама не мае. Заработная плата ніводнаму з сяброў Клубу не налічваецца. Зямельных надзелаў у карыстанні не маецца.

Галоўнай мэтай дзейнасці клуба з'яўляецца з'яўляецца вывучэнне, распаўсюджванне, папулярызацыя і далейшае развіццё гуманістычных каштоўнасцяў, прынцыпаў і ідэалаў алімпізму, садзейнічанне ажыццяўленню духоўнага, маральнага і фізічнага ўдасканалення асобы праз спорт і з дапамогаю спорту; удзел у фарміраванні ідэі здаровага ладу жыцця асобы, рэалізацыі палажэнняў міжнароднай праграмы "Спорт для усіх".

Вход. № 19-96-42/152

Грамадскае аб'яднанне "Самадзеяльны клуб па міні-футболе "Аматар" супрацоўнічае з Грамадскай арганізацыяй "Брэсцкая абласная федэрацыя футболу" (старшыня Г.І.Барысюк) і Асацыяцый "Беларуская федэрацыя футболу" (старшыня У.А.Базанаў).

**1.ГА "Самадзеяльны клуб па міні-футболе "Аматар" працягвае сваю** дзейнасць у 2022 годзе па юрыдычным адрасе: 224020 г.Брэст, вул.Войкава 79, тэл. 525852 на падставе бязтэрміновай Дамовы аб арэндзе нежылога памяшкання б.н. ад 24.12.2019 года (копія дамовы дадаецца).

На стан 01.01.2022 года колькасць грамадскага аб'яднання складае 12 асобаў згодна журналу ўліку членаў аб'яднаня. Арганізацыйных структураў аб'яднанне ў сваім складзе не мае.

**2.Звесткі аб мерапрыемствах, што праведзеныя грамадскім аб'яднаннем згодна са статутнымі мэтамі ў 2021 годзе:**

| № п/п | Дата мерапрыем-ства | Назва мерапрыемства | Мэты мерапрыем-ства | Змест мерапрыем-ства | Прозвішчы і імёны ўдзельнікаў мерапрыемства, у тым ліку журналістаў, блогераў, мадэратараў ў сацыяльных сетках |
|---|---|---|---|---|---|
| 01 | 06.03.-30.05. | XXX Чэмпіянат горада Брэста па міні-футболе сярод непрафесійных камандаў | Фарміраванне ідэі здаровага ладу жыцця асобы праз спорт з дапамогаю футболу | Гульні паміж самадзейнымі камандамі ў супрацоўніцтве з ГА Брэсцкая абласная федэрацыя футболу пад патранатам Асацыяцыі Беларуская федэрацыя футболу | Пратаколы гульняў з імёнамі ўдзельнікаў мерапрыемства дадаюцца; журналісты, блогеры, мадэратары ў сацыяльных сетках адсутнічаюць |
| 02 | 27.11.-26.12. | XXVI Адкрыты чэмпіянат па футзале ў рамках першынства Брэсцкай вобласці сярод непрафесійных калектываў | Фарміраванне ідэі здаровага ладу жыцця асобы цераз спорт з дапамогаю футболу | Гульні паміж самадзейнымі камандамі ў супрацоўніцтве з ГА Брэсцкая абласная федэрацыя футболу пад патранатам Асацыяцыі Беларуская федэрацыя | Пратаколы гульняў з імёнамі ўдзельнікаў мерапрыемства дадаюцца; журналісты, блогеры, мадэратары ў сацыяльных сетках адсутнічаюць |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | футболу | |

**3.Інфармацыя пра паступленні грашовых сродкаў і іншай маёмасці ў 2021 годзе**

Агульная сума паступлення грашовых сродкаў і іншай маёмасці – 36654.00 BYN (трыццаць шэсць тысячаў шасцьсот пяцьдзясят чатыры беларускіх рублёў) 00 капеек, з іх:

- уступных і членскіх узносаў – 0.00 BYN (нуль беларускіх рублёў) 00 капеек (не прадугледжана згодна Статуту);
- паступленні ад правядзення згодна з мэтамі Статуту лекцыяў, выставаў, спартыўных і іншых мерапыемстваў – 33974.00 BYN (трыццаць тры тысячы дзевяцьсот семдзесят чатыры беларускія рублі) 00 капеек;
- даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, што ажыццяўляецца ў парадку згодна з часткай 3 артыкулу 20 Закона – 0.00 BYN (нуль беларускіх рублёў) 00 капеек (не прадугледжана згодна Статуту);
- дабраахвотныя ахвяраванні – 0.00 BYN (нуль беларускіх рублёў) 00 капеек;
- паступленні ад замежных і міжнародных арганізацыяў – 0.00 BYN (нуль беларускіх рублёў) 00 капеек;
- паступленні ў якасці бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі – 2680.00 BYN (дзве тысячы шасцьсот восемдзесят беларускіх рублёў) 00 капеек;
- іншыя паступленні – 0.00 BYN (нуль беларускіх рублёў) 00 капеек.

**4.Інфармацыя пра выдаткі грашовых сродкаў і іншай маёмасці ў 2021 годзе:**

Агульная сума выдаткаў грашовых сродкаў і іншай маёмасці 33662,62 BYN (трыццаць тры тысячы шасцьсот шэсцьдзесят два беларускія рублі) 62 капейкі, з іх:

- колькасць работнікаў грамадскага аб'яднання – 0 асобаў;
- памер аплаты іх працы – 0.00 BYN (нуль беларускіх рублёў) 00 капеек;
- выдаткі на матэрыяльна-тэхнічнае зябеспячэнне – 33662,62 BYN (трыццаць тры тысячы шасцьсот шэсцьдзесят два беларускія рублі) 62 капейкі;
- выкарыстанне паступлення грашовых сродкаў і іншай маёмасці на наступныя мерапрыемствы:

| № п/п | Назва крыніцы выкарыстання грашовых сродкаў і іншай маёмасці | Сума, руб. | Назва мерапрыемства |
|---|---|---|---|
| 1. | У якасці ўступных і членскіх узносаў | 0.00 | |
| 2. | Ад правядзення лекцыяў, выставаў, спартыўных і іншых мерапрыемстваў | 30982,62 BYN | XXX Чэмпіянат горада Брэста па міні-футболе сярод непрафесійных камандаў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | XXVI Адкрыты чэмпіянат па футзале ў рамках першынства Брэсцкай вобласці сярод непрафесійных калектываў |
| 3. | У якасці прыбыткаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці | 0.00 | |
| 4. | У якасці дабраахвотных ахвяраванняў | 0.00 | |
| 5. | Ад замежных і міжнародных арганізацыяў | 0.00 | |
| 6. | У якасці бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі | 2680.00 BYN | XXX Чэмпіянат горада Брэста па міні-футболе сярод непрафесійных камандаў<br>XXVI Адкрыты чэмпіянат па футзале ў рамках першынства Брэсцкай вобласці сярод непрафесійных калектываў |
| 7. | З іншых крыніцаў (паказаць якіх) | 0.00 | |
| **Усяго:** | | 33662,62 BYN | XXX Чэмпіянат горада Брэста па міні-футболе сярод непрафесійных камандаў<br>XXVI Адкрыты чэмпіянат па футзале ў рамках першынства Брэсцкай вобласці сярод непрафесійных калектываў |